# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ДА ПЕРШАГА ДРАФТА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СТАНДАРТУ FSC

Першы драфт нацыянальнага стандарту распрацаваны на аснове міжнароднага стандарту FSC-STD-60-004 V1-0 International Generic Indicators (Адзіныя міжнародныя індыкатары - АМІ), які ў сваю чаргу распрацаваны на аснове новых "Прынцыпаў і крытэраў FSC" (FSC-STD-01-001 V5-2). АМІ з'яўляюцца абавязковымі для ўжывання для ўсіх краін, аднак, яны могуць быць адаптаваны да ўмоў краіны і да асаблівасцяў вядзення лясной гаспадаркі. Пры распрацоўцы стандарту распрацоўнікі прааналізавалі ўсе індыкатары і выкарыстоўвалі іх некалькімі спосабамі:

1) прыняты – скапіяваны з АМІ даслоўна ці з невялікай карэктоўкай тэксту, выкліканай асаблівасцямі перакладу;

2) адаптаваны: а) зменена фармулёўка індыкатара ў дачыненні да нацыянальнага заканадаўства; б) індыкатар падзелены на некалькі; у) індыкатары аб'яднаны;

3) выключаны - калі ён не ўносіць унёску ў якасць лесакарыстання ці не дастасоўны для Беларусі, ці калі крытэр цалкам не дастасоўны для Беларусі (напрыклад, якія тычацца карэнных народаў);

4) прапанаваны новыя індыкатары (у часткі ацэнкі радыяцыйнага забруджвання тэрыторыі).

Для кожнага з выпадкаў 2-4 у фінальнай версіі стандарту будуць падрыхтаваны абгрунтаванні.

**Структура стандарту**

Стандарт складаецца з 10 прынцыпаў і 57 крытэраў, якія ўжываюцца для Беларусі:

Прынцып 1. Адпаведнасць законам (8 крытэраў).
Прынцып 2. Правы працаўнікоў і ўмовы працы (6 крытэраў).
Прынцып 3. Правы карэнных народаў – не ўжываецца ў Беларусі.
Прынцып 4. Адносіны з мясцовымі супольніцтвамі (6 крытэраў).
Прынцып 5. Выгады ад лесу (5 крытэраў).
Прынцып 6. Прыродныя каштоўнасці і ўздзеянне на іх (7 крытэраў).
Прынцып 7. Планаванне кіравання (6 крытэраў).
Прынцып 8. Маніторынг і ацэнка (5 крытэраў).
Прынцып 9. Каштоўнасці асаблівай аховы (4 крытэра).
Прынцып 10. Здзяйсненне гаспадарчай дзейнасці (10 крытэраў).

Агульная колькасць індыкатараў у нацыянальным стандарце - 182, у адрозненне ад 202 у АМІ. У табліцы 1 ніжэй прыведзена колькасць індыкатараў па кожным прынцыпе ў АМІ і нацыянальным стандарце, і то, як яны былі скарыстаны.

Табліца 1 – Колькасць індыкатараў

| Прынцыпы | Колькасць крытэраў | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | прыняты | адап-таваны | аб'ядна-ны | выда-лены | новыя | Адзіныя міжнародныя індыкатары | **Нацыя-нальны стандарт** |
| Прынцып 1 | 11 | 5 | 8 | | | 24 | **24** |
| Прынцып 2 | 10 | 11 | 4 | 3 | 2 | 28 | **27** |
| Прынцып 3 | | | | 16 | | 16 | **-** |
| Прынцып 4 | 3 | 6 | 4 | 6 | 2 | 19 | **15** |
| Прынцып 5 | 6 | 7 | | | | 13 | **13** |
| Прынцып 6 | 14 | 2 | 7 | 6 | | 29 | **23** |
| Прынцып 7 | 2 | 11 | | | 8 | 13 | **21** |
| Прынцып 8 | 6 | 3 | | | 1 | 9 | **10** |
| Прынцып 9 | 7 | 2 | 3 | 1 | 1 | 13 | **13** |
| Прынцып 10 | 24 | 4 | 8 | 2 | | 38 | **36** |
| **Усяго** | **83** | **51** | **34** | **34** | **14** | **202** | **182** |

Для кожнага індыкатара былі распрацаваны верыфікатары, па якіх правяраюцца індыкатары і, адпаведна, выкананне крытэраў. Верыфікатары дазволяць у значнай ступені зняць розначытанні індыкатараў і вынікаючыя з гэтага пытанні, якія ўзнікаюць пры праверцы. Распрацаваныя верыфікатары з'яўляюцца абавязковымі для праверкі, аднак, у выпадку неабходнасці, могуць быць скарыстаны і дадатковыя верыфікатары.

Праект стандарту займае 63 старонкі і ўключаюць уводзіны, 10 прынцыпаў і дадаткі. У адпаведнасці з AMI нацыянальны стандарт павінен утрымоўваць некалькі абавязковых дадаткаў (табліца 2).

Табліца 2 – Дадаткі з AMI

| Назва | Апісанне | Стан |
|---|---|---|
| Дадатак A. Пералік дастасавальнага заканадаўства | Абавязковы | Будзе дададзена ў другі *драфт* |
| Дадатак B. Патрабаванні да навучання працаўнікоў | Абавязковы. | Патрабаванні ўключаны ў стандарт у выглядзе асобных індыкатараў |
| Дадатак C. Дадатковыя патрабаванні для экасістэмных паслуг | Рэкамендуемы | Уключаны ў стандарт у нязменным выглядзе. Ужываецца толькі пры сертыфікацыі FSC+. |
| Дадатак D. Канцэптуальная дыяграма сеткі ахоўваемых участкаў | Абавязковы ў якасці асновы для сеткі ахоўваемых участкаў | Улічана ў індыкатарах прынцыпаў 6, 9, 10. Акрамя таго маецца добра распрацаванае нацыянальнае заканадаўства. |
| Дадатак E. Элементы плана кіравання | Абавязковы | Улічана ў індыкатарах прынцыпа 7. |
| Дадатак F. Канцэптуальная аснова для планавання і маніторынга | Інфармацыйны. | Улічана ў індыкатарах. |
| Дадатак G. Патрабаванні да маніторынга | Абавязковы | Улічана ў індыкатарах прынцыпа 8. |
| Дадатак H. Стратэгія для падтрымання каштоўнасцей асаблівай аховы | Абавязковы | Распрацавана Нацыянальная канцэпцыя Каштоўнасцей асаблівай аховы |

**Група па распрацоўцы стандарту:**

*М.В.Ермохін* – каардынатар працоўнай групы па распрацоўцы стандартаў FSC для Беларусі (Інстытут эксперыментальнай батанікі ім.*В.Ф.*Купрэвіча НАН Беларусі),
*А.А.Буй* – член працоўнай групы (Гродненское производственное лесохозяйственное объединение),
*Т.З.Слабоднік* (УП "Белгипролес"),
*У.У.Усеня* – член працоўнай групы (Інстытут леса НАН Беларусі),
*В.А.Фенчук* – член працоўнай групы (ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"),
А.І.Шакуро – член працоўнай групы (ООО "Вудкрафт"),
Ю.С.Толкач – член працоўнай групы (УП "Беллесэкспорт"),
*С.І.Мінкевич* – эксперт (Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт),
*С.А.Углянец* – эксперт (Інстытут эксперыментальнай батанікі ім.*В.Ф.*Купрэвіча НАН Беларусі).

*Першы раўнд кансультацый пройдзе з 3 кастрычніка па 2 снежня 2017 гады. Заўвагі і прапановы па стандарце просім накіроўваць па адрасе yermaxim@yahoo.com.*